ВЫБАР

ГАЗЕТА ДЭМАКРАТЫЧНЫХ ПЛЫНЯЎ ПРЫДЗВІНСКА- ПРЫДНЯПРОЎСКАГА КРАЮ

№ 4 (10) 19 лютага 1992 г. Цана 40 кап.

Акцыі пратэсту

СВЕЧКІ ПАМЯЦІ І АБУДЖЭННЯ

Яны яшчэ—дзеці. Нашы зялёныя дзеці, якія не выраслі ў поўнай меры, каб адказваць за сябе і за свае ўчынкі. Але гэта тыя дзеці, што пачалі задумвацца ў праваменрнасці і абгрунтаванасці нашага прысуду над імі. Дакладней, прысуду тых, якія занеслі міліцыянтскія дубінкі над юнаком, іх таварышам па вучобе, і якога назаўсёды не стала сярод іх.

Яны сабраліся на другім паверсе медыцынскага інстытута, каб правесці мітынг памяці і, адначасова, мітынг пратэсту супраць гвалтоўнай смерці, учыненай над іх аднакурснікам.

—Ен бы вясёлым і адкрытым,—гучаць словы былой аднакласніцы.

—Ён быў таварыскім і надзейным,..—гаворыць аднакурсяік.

—Ён быў, ён быў,..—гучыць у вушах. Ён, галоўнае, быў маладым, і ён мог бы стаць... Маладым жа наканавана стаць будучыняй... Але Сашы Баранава ўжо няма.

Юнак з абласной Асацыяцыі студэнтаў заклікае не хваляваць грамадскасць, не прыцягваць яе ўвагу, лічыць, што студэнты не павінны са сваімі патрабаваннямі ісці да старшыні абласнога Савета.

—Трэба вылучыць з вашага асяроддзя думаючых людзей, якія склалі б групу, што кантралявала б следства.

—Наіўна... Хто нас туды дапусціць? Як гэта мы будзем кантраляваць?—раздаецца ў адказ.

—Думайце, маладыя людзі! Вы—будучыня. Думайце, з чым прыйдзеце на выбары ў наступны раз,—гаворыць старшыня клуба «За дэмакратычныя выбары» Барыс Хононавіч Хамайда.

* * *

...Ланцугом ад крайняга вугла амфітэатра да будынінны абласнога Савета выстраіліся студэнты медыцынскага, а таксама юнакі і дзяўчаты з іншых ВНУ горада. Здаецца, сотні дзве, ці болей. У руках—запаленыя свечкі, плакаты. «Забойцаў Сашы—да адказнасці», «На яго месцы мог быць кожны», «Каго абараняе АМАН?» Потым маладыя людзі грунтуюцца каля параднага ўладавага пад'езду, накіроўваюць сваіх прадстаўнікоў з адпаведным патрабаваннем да кіраўнічых асоб вобласці.

З вокнаў абласнога Савета з усіх паверхаў назіраюць цікаўныя чыноўніцы. Што думаюць яны?

* * *

Студэнтаў медыцынскага інстытута, якія патрабавалі стварэння спецыяльнай камісіі па расследаванню забойства Аляксандра Баранава, прыняў першы намеснік старшыні аблвыканкома **Ц. І. Місуна**. Ён завэрыў моладзь, што дакладзе аб усім старшыні аблвыканкома **У. П. Кулакову** і дапамога студэнтам арганізаваць сустрэчу з ім.

* * *

Учора дэлегацыю студэнтаў прыняў старшыня аблвыканкома У. П. Кулакоў.

Наш кар.





Весткі з раёнаў

ЗА АДСТАЎКУ СВАІХ УЛАД

Па ініцыятыве Савета рабочых калектываў, гарадской суполкі БНФ ва Ушачах адбыўся мітынг жыхароў горада. Каля 2000 чалавек выйшлі на стадыён з патрабаваннем вынесці на чарговую сесію райсавета пытанне аб адстаўцы старшыні райвыканкома І. Барунава, намесніка старшыні райвыканкома П. Смаргуна, пракурора М. Таранды, начальніка РАУС П. Курусёва, суддзі В. Шылко, старшыні райспажыўсаюза М. Храменка, а таксама рэдактара раённай газеты.

Прычына незадавальнення ўладамі раёна ў іх схаўрусаванай дзейнасці па вывазцы тавараў народнага спажывання за межы Ушаччыны, у тым ліку і ў Польшчу, парушэнні ў размеркаванні па талонах, злачынная спекуляцыя.

Думаецца, што для жыхароў раёна гэтыя падзеі стануць пераконваючым фактарам на карысць рэферэндуму. Такія ўлады, як вышэйшыя, так і іх структуры на месцах, неабходна мяняць.

М. ШЭКЕЛЬ.

«ГАРАЦЬ» ПАЖАРНІКІ

Калектыў Лепельскай пажарнай часці далучыўся да папераджальнай забастоўкі, якая пракацілася па ўсёй рэспубліцы.

Чатыры машыны, якія мае пажарная ахова, за 20 гадоў прыйшлі ў нягоднасць. У пажарнікаў адсутнічаюць каскі, вогнетышыцелі, форменнае адзенне. Грошай на абзавядзенне практычна няма.

І ў сферы сацыяльнага забеспячэння таксама куды ні кінь—усюды клін. Некаторыя працуюць у пажарнай ахове па сорак гадоў, і за гэты час ні адзін чалавек не атрымаў кватэры. Ды і зарплата, як чёшчына пенсія. Сорам прыносіць такую ў дом...

Л. БАРАДЗЕЙКА, гор. Лепель.

Рэплика

«Меня там не было»

Областная газета «Молодежные новости», опубликовав интервью со старшим следователем прокуратуры Октябрьского района В. Трещеткиным и командиром отдельной роты милиции специального назначения УВД майором В. Лавреновым, а также другие материалы по делу о гибели студента Александра Баранова, не делает выводов.

Как же использовали должностные лица предоставленную им возможность? В душах читателей они зародили еще больше сомнений. Нам внушается мысль: мол, неправомерные действия студента спровоцировали известный результат. И это на начальном этапе следствия, когда дело передано в Прокуратуру Республики Беларусь. Поразительно!!!

Я бы мог привести достаточно «проколов» со стороны не в меру откровенных должностных лиц. Но не хочу мешать следствию. Правда, одно противоречивое высказывание майора Лавренова хочется процитировать. На вопрос: «Можно ли было задержать Баранова без побоев?», последовал ответ: «Мне трудно судить, меня там не было». На следующий вопрос: «Как вы относитесь к происшедшему?» Лавренов ответил: «Как командир я не приветствую того, что случилось, хотя ребята действовали правомерно»... Вот те на!

Как можно утверждать о правомерности действий, если на месте событий не был. Товарищ майор—ясновидящая Ванга? Или он уже ознакомлен с первоначальными следственными действиями?

В. ХОРУНЖИЙ, юрист.

P. S. Несколько раз в этом интервью бросалось в глаза выражение «бойцы спецроты». В связи с этим я вспомнил публикуемое часто в газетах рекламное объявление: «Срочно требуются мясокомбинату бойцы скота». А что, может быть действительно, товарищ майор, вашим бойцам надо переквалифицироваться?

ДЕМОНСТРАТИВНО ПОКИНУЛИ ЗАЛ

Не получился разговор на встрече начальника управления внутренних дел облисполкома А. Клещенка с преподавателями и студентами Витебского медицинского института.

Коллектив вуза собрался в актовом зале и ждал от генерала каких-то человеческих разъяснений по поводу гибели Саши Баранова. А гость долго и нудно говорил о положении с преступностью в области. Тогда преподаватели и студенты встали и демонстративно покинули зал. И генерал вместе со своим подчиненным-полковником остались в этом зале одни.

Наш корр.

Нашы інтэрв'ю

У МЕНСКУ СТВОРАНЫ НЕЗВЫЧАЙНЫ АРГКАМІТЭТ

Суд над камунізмам павінен быць актам самаачышчэння, а не «фізічнай расправай» над радавымі камуністамі, як аб гэтым лементуюць былыя партыйныя газеты.

Нядаўна ў рэдакцыі газеты «Выбар» пабываў старшыня Нацыянальна-Дэмакратычнай партыі Беларусі Анатоль Астапенка. Ен—кандыдат фізіка-матэматычных навук, асістэнт кафедры вылічальнай тэхнікі Беларускага тэхналагічнага інстытута. Наш карэспандэнт задаў яму некалькі пытанняў адносна дзейнасці НДПБ як самастойнай палітычнай арганізацыі.

—Анатоль Уладзіміравіч, з чым звязана неабходнасць стварэння Нацыянальна-Дэмакратычнай партыі?

—НДПБ як самастойная палітычная арганізацыя заявіла аб сабе адной з першых у рэспубліцы яшчэ паўтара года назад. У нашым разуменні нацыяналіст і патрыёт—гэта адно і тое ж. Справа ў тым, што першае слова камуністычнай імперыяй узведзена ў ранг адмоўнага, з чым патрабавалася змагацца любымі сродкамі.

У першую чаргу, мы—партыя дэмакратычная. І ўтварыліся для таго, каб агульныя дэмакратычныя пераўтварэнні ішлі побач з вяртаннем народа да сваёй нацыянальнай свядомасці. Гэта неабходна, паколькі беларусы ў асноўнай масе выракліся не толькі сваёй мовы, але і традыцый, культуры. Многім у гэтым садзейнічала інтэрнацыянальная КПСС—КПБ. Таму мы—антыкамуністы, выступаем за сцвярджэнне суверэннага права беларусаў самім вырашаць свой лёс.. У гэтым сэнсе наша партыя і экалагічная, выратавальная.

—Алесь Емяльянаў мой асабісты знаёмы па філфаку БДУ, а таксама па саюзу пісьменнікаў Беларусі. Ен адзін з першых арганізатараў НДПБ, здаецца, актыўны змагар за нацыянальнае адраджэнне. Тым не менш, ён выведзены з кіруючых органаў НДПБ?

—Ім у рэспубліканскай прэсе было выказана прызнанне аб супрацоўніцтве з КДБ, што стала дыскрэдытацыяй нашай партыі і адштурхнула ад яе вельмі многіх. Мы лічым, што Емяльянаў павінен быў адкрыцца, у першую чаргу, сваёй партыі, а не парушаць парадак, што ўласцівы любой палітычнай арганізацыі.

—На каго вы абапіраецеся, якая ваша матэрыяльная база?

—Самафінансуемая за кошт узносаў—2% ад зарплаты. Абапіраемся на ўвесь беларускі народ, а не на нейкі асобны пласт насельніцтва, выступаем за прыярытэт прыватнай уласнасці.

—Вы сказалі, што вы—антыкамуністы. Сёння няма КПСС—КПБ. Ці лічыць ваша партыя, што праблема камунізма—антыкамунізма зменшылася.

—Камуністычныя структуры толькі страцілі назву. Па сутнасці яны засталіся і праводзяць прыватызацыю ў сваіх інтарэсах. Якраз тыя самыя, што з партыйных крэслаў трубілі пра сацыялістычны выбар з камуністычнай перспектывай. Таму ў канцы мінулага года і была апублікавана Заява Вышняе Рады НДПБ **«Аб ліквідацыі рэштkaў камуністычнага засілля»**, дзе выказвалася думка аб правядзенні міжнароднага трыбунала па фактах злачыннасці камунізма. Ужо створаны аргкамітэт, прапануўваецца правесці ў Менску Міжнародную канферэнцыю прадстаўнікоў пацярпеўшых народаў. Мы прапануўваем судзіць камуністычную ідэалогію, прыраўняўшы ўласцівую ёй прапаганду класавай нянавісці да расізму. Мы лічым неабходным назаўсёды забараніць стварэнне палітычных арганізацый, якія базіруюцца на такой ідэалогіі. У Чэхаславакіі, Літве гэта зроблена, а ў нас спакойна адраджаюцца. Суд павінен быць проста актам усеагульнага самаачышчэння, а «не фізічнай расправай» над радавымі камуністамі—узносаплацельшчыкамі, як аб гэтым лементуюць былыя партыйныя газеты з яўнай мэтай, каб гэтых радавых, што нават дакументаў сваёй партыі не ведаюць, выставіць наперад у абарону партнаменклатуры.

—Зараз рыхтуецца рэферэндум па адстаўцы Вярхоўнага Савета і ўрада. Нядаўна В. Кебіч заявіў сваім вясковым выбаршчыкам, што, ён рады, што народ зразумеў: «коней на пераправе не мяняюць».

—Так падаецца Кебічу. А наконт «коней» ва ўрадзе і ВС, то яны ці зусім не цягнуць, ці цягнуць не туды. Народ, па пагаршэнню свайго становішча, гэта адчувае.

Каб супрацьстаяць наменклатуршчыкам на будучых выбарах, мы ўваходзім у блок «Новая Беларусь», які павінен быць блокам выключна дэмакратычных сіл, куды не будзе дарогі былым партапаратчыкам. Як партыя, што думае пра лёс нацыі, пра яе адраджэнне, НДПБ з усёй катэгарычнасцю заяўляе аб неабходнасці адстаўкі сённяшніх уладавых структур.

Вера АДРАДЖЭНСКАЯ.

Все дальше катимся

Кто вернет долги Финляндии?

Приезд депутатов от оппозиции в Верховном Совете Республики Беларусь—событие в жизни Витебска. Встречи проходили в переполненных аудиториях. Это говорит о том, что многие витебляне заинтересованы в возрождении Республики Беларусь.

Наша республика все дальше катится к экономическому краху. Это началось не вчера, к этому шли 74 года. Большинство депутатов Верховного Совета представляют собой бюрократические структуры, они вырабатывают постановления, наносящие ущерб экономике, блокируют конструктивные проекты для установления рыночных отношений, выдвигаемые оппозицией. Не успевает парламент реагировать на изменения в экономической политике других государств. Свою валюту вводят Украина, Прибалтика, а скоро и Россия. И мы окажемся в хвосте. Обесцененные рубли хлынут в нашу республику, и все будет скуплено. Например: прибалтийские республики уже скупают у нас скот, многие промтовары и даже стеклотару.

Правительство мало развивает торговые отношения с соседними странами (Польшей, Германией, Чехословакией, Австрией и др.), а решило делать закупки продуктов в Китае. В какую сумму обойдутся перевозки на такое расстояние? Кому это выгодно?

В республике имеются значительные природные ресурсы (калийные соли, нефть, железная руда, бурый уголь, торф и т. д.), относительно благоприятные условия для развития сельского хозяйства, много специалистов с высоким интеллектуальным уровнем, развитая промышленность. И при всем этом мы не можем использовать правильно наши ресурсы, остаемся нищими.

Даже страны, у которых худшие природные условия, чем у нас, (Финляндия, Швеция, Норвегия) имеют высший экономический уровень благодаря исторически установившемуся там демократическому строю. А бывший СССР задолжал немалую сумму даже Финляндии.

Не нужен нам такой парламент, который топчется перед дверью, ведущей к новым экономическим отношениям и не желает или не может вывести Беларусь из обломков тоталитарного строя.

Следует решительно поддержать предложение депутатов от оппозиции Верховного Совета о проведении референдума о переизбрании нынешнего Верховного Совета.

Л. ТАМАРОВИЧ,
член ОДПБ.

г. Витебск

Што аб нас пішуць

PISMO INFORMACYJNO - KULTURALNE WSCHODNIEJ BIAŁOSTOCCZYZNY

Czasopis

NR 9 WRZESIEŃ 1991 CENA 1800 zł

- FAŁSZOWANIE HISTORII (str. 4)
- DOMAGAJMY SIĘ NASZYCH PRAW (str.7)
- PO CO TEN PODZIAŁ W WYBORACH? (str.8,9)
- LETNIE WSPOMNIENIA (str.10)
- BTSK - polityczny bankrut (str. 15)

BIAŁYSTOK ● BIELSK PODLASKI ● HAJNÓWKA ● SIEMIATYCZE ● SOKÓŁKA

Перыядычнае выданне гарадскога клуба «За дэмакратычныя выбары» ў Віцебску змяшчае артыкулы, інтэрв'ю з палітычна-грамадскім зместам. Яны прадстаўляюць праблемы сённяшняга дня Беларусі, гавораць аб неабходнасці дэмакратычных зменаў. Матэрыялы змяшчаюцца на рускай ці беларускай мове. Цікавай асаблівасцю газеты з'яўляюцца лісты ад чытачоў, спосабы прадстаўлення праблемаў таталітарнага грамадства. Заўважальна добрае афармленне, здымкі і графічныя працы.

«Часопіс» № 1 за 1992 год, Беласток.

НОВЫ ДЭФІЦЫТ—МАРКІ

Не, не нямецкія. А нашы, родненькія, паштовыя. Няма іх ні ў спецыялізаваных крамах, ні ў аддзяленнях сувязі. Прычына—як гэтае ні дзіўна—павышэнне цэнаў за перасылку. Зніжненне саюзнае пошты выклікала яшчэ большы хаос, які ўжо панаваў на нашых поштах колькі апошніх месяцаў. Прыкладі сваю руку да нястачы марак і філатэлісты. Але іх вінавацiць нельга: праз некалькі гадоў савецкія паштовыя знакі стануць нятанная рэдкасцю.

Ю. ТУТЭЙШЫ.



Эти чудесные люди люди строят мост Блохина в Витебске. Глядя на них, не скажешь, что они, как и все мы, переживают трудности, вызванные экономическим кризисом в Республике.

Сильные духом! Разве не так?

Люди по-прежнему надеются на улучшение жизни, на тех, кого они избирали в Советы.

А будет ли оправдано народное доверие? Это должны решать они!

Добрый день, друзья!

Обидно, что газета выходит редко, хотелось, чтобы она выходила хотя бы два раза в неделю. Людям нужно знать правду, в других газетах не всегда прочитаешь правдивую статью.

Интересная статья «Патриотизм в запасниках» С. Хорощева. Мы считаем, что сейчас срочно нужно проводить референдум, иначе может быть поздно. Бедный наш белорусский народ! Сколько бед он уже перетерпел и продолжает терпеть. Нужно что-то делать.

Ю. АЛЕКСАНДРОВИЧ.

Беларусь глазами москвичей

СТАРЫЕ ПРОФСОЮЗЫ ВЫХОДЯТ НА ТРОПУ ВОЙНЫ

Станислав Шушкевич ратует за рыночную экономику, а Вячеслав Кебич—за единое рыночное пространство.

В конце минувшей недели глава парламента вернулся из Давоса, где он участвовал в работе международного экономического форума, а глава правительства—из поездки по Западной Беларуси, где он встретился с разгневанными председателями колхозов и директорами государственных предприятий. Более всего последних волновали высокие налоги, недавно утвержденные парламентом с подачи правительства, и разрыв устоявшихся экономических связей с другими государствами Содружества.

Об этом шла речь и на встрече трех сотен активистов Федерации профсоюзов Беларуси (ФПБ) со Станиславом Шушкевичем. Мне уже приходилось писать о том, что старые профсоюзы—это фактически «партия промышленной номенклатуры». Нынешняя встреча еще раз это подтвердила. На протяжении четырех часов главе парламента пришлось выслушивать просьбы о снижении налогов в отдельно взятых отраслях и о повышении заработной платы в отдельно взятых профессиональных группах. А под занавес встречи председатель ФПБ Владимир Гончарик «попросил за всех»: «Никакого рынка у нас нет, и не надо бояться административных мер». Набравшийся свободного духа Швейцарии Станислав Шушкевич держался мужественно: не сделал ни одного популистского заявления, не дал ни одного обещания. «Если заботиться о благополучии каждого трудового коллектива, то придется отказаться от проведения реформ, от рыночной экономики, от лучшей жизни»,—резюмировал председатель Верховного Совета Беларуси.

Еще одной отличительной чертой мероприятия стали требования профактивистов восстановить единое экономическое пространство. Один из выступавших проинформировал о намеченном на 14 февраля митинге под лозунгом «Руководители СНГ! Дайте людям заработать на жизнь». На что Станислав Шушкевич заявил: «Я за цивилизованные формы проведения митингов, но если создастся угроза нормальной работе встречи глав государств 14 февраля, то власть вынуждена будет принять меры».

В отличие от главы парламента, премьер Вячеслав Кебич с пониманием воспринимает тезис о едином экономическом пространстве. На встрече глав правительств СНГ 8 января в Москве именно он больше всего возмущался позицией Украины, приславшей на встречу неполномочную делегацию. Нужно отметить, что кабинет Кебича всегда как бы капитулировал перед экономическим давлением Москвы. Так, указ Ельцина о запрещении вывоза товаров за пределы России вынудил белорусское правительство подписать двустороннее соглашение о снятии ограничений в хозяйственной деятельности. В этом документе предусмотрено, что тарифы на транзит всеми видами транспорта, включая трубопроводный, остаются на прежнем уровне. При этом ничего не сказано о ценах на энергоносители.

Последние события показывают, что на встрече 14 февраля Беларусь будет отстаивать единое экономическое пространство.

«Независимая газета»
11.02.92 года.

В записную книжку активиста партии коммунистов Беларуси



«Мы Россию отвоевали... должны теперь Россией управлять»,—заявил Ленин. В начале 1918 года во все концы страны идут ленинские приказы: «... будьте образцово беспощадны». Надо поощрять энергию и массовидность террора...» «Если Вы абсолютно уверены, что нет сил для свирепой и беспощадной расправы, то телеграфируйте». «Расстреливать, никого не спрашивая и не допуская идиотской волокиты».

* * *

Когда звучат призывы—читайте Ленина и не верьте хулителям,—хочется спросить: к каким источникам обращаться? Ведь так называемое Полное собрание сочинений Ленина—это фальсификация. В нем множество купюр, причем без всяких отточий. Например, в 51-м томе опубликовано письмо Л. Троцкому от 22 октября 1919 г. А вот подлинный текст одного из образцов этого письма (купюра выделена):

«Покончить с Юденичем (именно покончить—добить) нам дьявольски важно. Если наступление начато, нельзя ли мобилизовать еще тысяч 20 питерских рабочих **плюс тысяч 10 буржуев, поставить позади их пулеметы, расстрелять несколько сот** и добиться настоящего массового напора на Юденича?»

«Комсомольская правда» (12 **февраля 1992 г.) из материала** под заголовком «Владимир Ильич ЛЕНИН: «Морали в политике нет.»

Крокі да рэферэндума

Такія дэпутаты нам не патрэбны!

У пачатку хачу нагадаць старую беларускую казку аб тым, што ўсемагутны Бог пасля таго, як уладкаваў зямлю беларусаў, каб не здавалася яна раем, рашыў даць ёй самае горшае на зямлі начальства. Увесь наш шлях сведчыць аб тым, што і сапраўды так яно ёсць! Дзякуючы нейчай «цвёрдай руцэ» пачалі адбывацца ў нашым жыцці зусім незразумелыя з'явы. Прапалі ўсе тавары, прадукты харчавання, растуць злачыннасць, цэны і чэргі. Становішча пагаршаецца з кожным днём. Паўстае справядлівае пытанне: а што ж увесь гэты час рабілі людзі, якія з такім імпэтам браліся кіраваць намі і абяцалі адстойваць нашыя інтарэсы?

І вось справа дайшла да таго, што простаму чалавеку яго праца перастала прыносіць карысць. Дзеля чаго працаваць, калі купіць нечага? Дзеля чаго нам выдалі «візіткі»? Хіба для таго, каб на які-небудзь час заспакоіць?

Зараз жа мы ўваходзім, прама кажучы, у паласу галечы. І трэба добра разумець, што ў гэтым вялікая доля віны нашых шаноўных дэпутатаў. Вось чаму неабходна правесці рэферэндум наконт рэарганізацыі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Сапраўды, такія дэпутаты нам не патрэбны.

А. КАРАЛЕВА,
настаўніца Міёрскай СШ.

ВЫКАЗАЛІ НЕДАВЕР

У Полацку адбыўся мітынг, праведзены па ініцыятыве гарадской Рады БНФ, па арганізацыі рэферэндуму аб недаверы Вярхоўнаму Савету і ўраду Рэспублікі Беларусь, а таксама аб перадачы будынка райкома партыі, на які прэтэндуе гарвыканком, музычнай школе.

На мітынгу выступілі намеснік старшыні Сойма БНФ Юры Хадыка, прадстаўнік фонду «Дзеці Чарнобыля» Валянцін Буйвал, кіраўнік Полацкай Рады БНФ Анатоль Кулік.

Юрась КАСЦЮК.

НАЧАЛО ПОЛОЖЕНО

13 февраля состоялось заседание центральной комиссии по проведению референдума Республики Беларусь, где была зарегистрирована инициативная группа и вопрос, выносимый на референдум: «Считаете ли Вы необходимым проведение осенью 1992 года выборов в высший орган государственной власти Республики Беларусь на основе Закона «О выборах народных депутатов Беларуси», проект которого внесен оппозицией БНФ в Верховном Совете, и в связи с этим досрочный роспуск действующего теперь Верховного Совета?»

Временный контактный телефон Витебской инициативной группы 37-35-06.

З нагоды публікацый мясцовай прэсы

АДКУЛЬ МАЯ НЕЦЯРПІМАСЦЬ?

—такое пытанне вырвалася да мяне ад аднаго са старэйшых калег-журналістаў з «Віцебскага рабочага»

—У майго адзінага, народжанага пад аперацыйным нажом і ў сталым узросце сыночка, паваліцаны шчытавідныя залозы. Ён з'явіўся на свет у Талачыне, у той год, калі «Чарнобыля счарнелыя радкі ўпісаліся ў пасведчанне дзіцяці, а я, хоць найшчаслівейшая маці, сцірала слёзы страху са шчакі».

Аб усім дазналася ўжо тут, у Віцебску. А там я не ведала нічога і купляла свайму сыночку кандытарскія пачастункі з мукі, забруджанай радыенуклідамі, якую да «дапушчальнай» нормы прыказвалі разбаўляць розныя Шчуркі ды Бобышавы, якія горача падтрымалі пераварот, а потым у абласной газеце імкнуліся даказаць пасля прыпынення іх дзейнасці,як сумленна служылі райком людзям.

Калі ўмайму сыну споўніўся год, ваш партыйны бог Камай атрымаў ордэн Леніна за перавыкананне плана па збожжавых у Чарнобыльскай зоне, перакацiў у Мінск і адкрыў зялёнае святло для свайго сына-каапэратара. А вы ўсе партплацельшчыкі, выступаючыя за камуністычныя ідэалы, ці абураліся?

На партсборышчы ў былым абкоме КПБ ставілася ў прыклад старшыня Талачынскага калгаса Л. Сіроткіна, якая праводзіла правільную палітыку па захаванню партыйных радоў. «Вось так трэба,—гаварылася,—падаеш заяву аб выхадзе з КПСС, падавай заяву і аб выхадзе з калгаса». А куды селяніну з хатай,дзецьмі ды кароўкай? Як жа вы захоўвалі апошнімі капейкамі калгаснікаў сваіх Камаеў.

Паважаю камуніста, які перасэнсаваў усё і выйшаў з партыі, або таго, што застаўся камуністам, а не мяняе абрэвіятуры КПБ на ПКБ і патрабуе долю ад першай. Толькі апошні гнюс, памяняўшы назву, бравіруе тым, што застаўся з білетам КПСС. Прычым тады ПКБ? Навошта?

Мая нецярпімасць, як лічыць той-сёй, і ад бязглуздзіцы камуністычных утварэнняў, якія за рэанімацыю СССР, за сацыялізм, за адзіное войска (пішуць жа аб гэтым адстаўной казы барабаншчыкі) пасля таго, як пачалася прысяга на вернасць народу Беларусі. Цікава, як яны будуць аб'ядноўвацца ў незалежных дзяржавах, напрыклад, ПКБ, Ніна Андрэева, Жырыноўскі, на аснове камуністычнай ідэі і адзінай тэрыторыі. Танкамі, арміяй?

Я не магу паважаць тых камуністаў Беларусі, якія выступаюць за Саюз, але, супярэчачы самі сабе, не выступаюць супраць Вярхоўнага Савета, які прыняў законы аб яе незалежнасці, на іх думку, прадаў іх. **Родненькія камуністы, новыя і старыя, гэта ж не Зянон Пазьняк, якому ў Віцебску пры сустрэчы не было чаго сказаць тым, хто яго імкнуўся апляваць хоць задним чыслом, развалiў Саюз і зрабіў Незалежнай Беларусь, а вашы напалоханыя партыйцы.** Так што ўсе падставы галасаваць за іх роспуск. Што, не так?

Як жа вы не будзеце галасаваць супраць, калі ваша неапраўданая надзея ў ВС прымае закон аб зямлі, прыватызацыі, галоснасці. Куды ні кінь, а з апазіцыяй вам па дарозе.

Для чалавека ўласцівы слабасці і пагрэшнасці. Я—не без граху. А вось сумленным, на іх думку, камуністам, якія за сацыяльную справядлівасць, нізка прасіць дапамогі ў прадпрымальнікаў, нават партыйных, бо яны ж здрадзілі вашым ідэям. А калі вы павязаны, дык адкіньце к чорту свае ідэі камунізма і не тлуміце няшчасным людзям галаву сваёй сацыяльнай справядлівасцю. Усё роўна будзеце гарбаціць на камуністаў—уласнікаў.

Трэба жыць па законах, якія прапаведуеце, а не «клапаціцца» аб абароне народа ад прадпрымальнікаў, а якіх ідзеце за падтрымкай і зрастаецеся з імі.

Мая нецярпімасць да фарысейства камуністаў, і новых, і старых, якія ў мясцовым друку нават пры абароне справядлівасці ў гарэлачным размеркаванні («Віцебскі рабочы»), або ў тым, што салдатам не топяць казармы («Віцьбічы»), вінавацяць дэмакратаў, якія ірвуцца да ўлады, а не ўказваюць канкрэтна на тых, якія сёння ва ўладзе ў горадзе.

І яшчэ, калі ставіць нехта з камуністаў, былых ці новых, у заслугу тое, што «Віцебскі рабочы» выхаваў плеяду журналістаў для іншых рэдакцый, дык трэба ж не разгортваць кампанію супраць таго, каб і іншыя рэдакцыі мелі адпаведную долю ў будынку на Гогаля, 17. Яны ж з такім жа правам. Ды хто вас знішчае! Бога пабойцеся. Вас жа ніхто з будынку рэдакцыі не гоніць. Вы ж у ім далі прытулак (увесь пяты паверх),і незадарма, малому прадпрыемству. А чытачу сказаць пра гэта баіцеся, зводзіце яго ў зман. Магчыма, вы плануеце і яшчэ некалькі паверхаў аддаць пад камерцыю!

Вось такая двурушнасць «сумленных і прынцыповых камуністаў» і выклікае мае адносіны да іх. Спадзяюся толькі на ўзаемнасць і не сумняваюся ў ёй.

Яўгенія МАЛЬЧЭЎСКАЯ.

Кто нами руководит?

ДИРЕКТОРА ОПРОВЕРГАЮТ УЧЕНИКИ

После второго заседания народного суда, а всего их было три, ко мне подошли некоторые свидетели ответчика и стали упрашивать не писать в газету. Доводы? Мол, журналисты ищут «жареные» факты, а это судебное разбирательство, дескать, не тот случай.

И как мне молчать? Теперь я понимаю тех, которых распинали на кресте. Только не гвозди во время этого судебного процесса вбивали в меня, а разрывали на куски душу невинные, растерянные, недоуменные взгляды подростков—свидетелей.

А более всего меня, постороннего на этом суде человека, вдавливал в скамейку стыд за взрослых. Я не знал до сих пор, что он может быть таким острым и беспощадным. Хотелось подняться и бежать из зала. Куда угодно, хоть на Голгофу. Лишь бы не видеть, не слышать говорящих неправду, увести от них ребят, которые явились в суд на защиту любимой учительницы.

О страхе тоже можно сказать. И людей, прошедших огонь, воду, медные трубы, заставляет трепетать возглас секретаря: «Встать! Суд идет!» А предупреждение об уголовной ответственности за дачу ложных показаний? Так ли его в суде выслушивают бездушно? Не уголовники, а только вступающие в жизнь мальчишки и девчонки прошли крещение судебным разбирательством.

Уверен, им было все-таки боязно предстать свидетелями. Помогала надежда. Все, кто отстаивал правду, возлагали свои помыслы на народного судью Д. Кулевича. Ему пришлось нелегко при расследовании этого, казалось на первый взгляд, несложного гражданского дела.

Тогда на суде я предположил и о существовании другого страха, который гнездился в школе, страха перед сильными мира сего.

Бедный и убогий раб—школьный учитель! Так и хочется добавить: «советский». Но слава Богу, наш педагог от этого титула, хотя бы внешне, освободился. Это «высокое» звание обязывало его работать по инструкциям надзирающих организаций. Кто только нашего учителя «не проверял»! Парт, проф, сов и прочие контролирующие работники плюс свои ведомственные пришибеевы. И ничего будто-бы не делали вышестоящие, а изматывали проверками, педсоветами, курсами повышения, документацией и т. п.

На первом судебном заседании ответчица, директор средней школы № 9, увидела меня и, в упор кольнув взглядом, спросила: «Кто вы такой?» Пришлось сообразить, что я нахожусь не на территории вверенного ей учебного заведения. Пока раздумывал, как ответить, пожилая женщина перешла в наступление: «Я—Дулина!—заявила она, надеясь этим вызвать эффект, не добившись его, уточнила,—директор девятой школы».

Итак, не какую-либо возглавляет школу, а именно девятую. Директорствует здесь около 20 лет. Многие в городе считают эту школу престижно-показательной.

Не сужу об уровне знаний в девятой. Зато абсолютно уверен: здесь самым лучшим образом проводили мероприятия в свете партийных съездов и пленумов. Конечно же, не ставлю это в вину Дулиной. Такое характерно для всех школ, но только в СШ № 9 учительница предъявила судебный иск своему директору, обвинила в клевете.

